рыял па вывучэнні жыцця і творчасці Я. Коласа. Відавочна, што гэта своеасаблівы летапіс падзей, убачаных вачыма класіка нацыянальнай літаратуры, занатаваная пісьменнікам гісторыя. Вельмі важна, што ў апісанні падзей трапілі таксама згадкі пра Я. Купалу, яшчэ аднаго волата беларускай літаратуры. Гэтыя невялікія па аб'ёме фрагменты тэксту не толькі дазваляюць убачыць адносіны паміж паэтамі, дакладней, некаторыя асаблівасці стаўлення Я. Коласа да Я. Купалы, але і гавораць пра ўдзел пісьменніка ў мерапрыемствах па ўшанаванні памяці Я. Купалы, акрэсліваюць яго ролю захавальніка і каардынатара вывучэння творчасці вялікага песняра. Дзённікавыя нататкі захоўваюць таксама шмат звестак, карысных для купалазнаўства.

*Эмануіл Іофе*

## ЦК КПБ І ОРГАНЫ БЯСПЕКІ СУПРАЦЬ АСОБЫ І ТВОРЧАСЦІ ЯНКІ КУПАЛЫ (1924–1938)

Адной з «белых плям» у біяграфіі Я. Купалы з'яўляюцца ўзаемаадносіны народнага песняра з кіраўніцтвам Камуністычнай партыі Беларусі і органамі бяспекі БССР. Хоць існуюць публікацыі па гэтай праблеме, дадзенае пытанне патрабуе новага асэнсавання падзей 1920–1930-х гг., асэнсавання малавядомых і невядомых старонак біяграфіі Я. Купалы і спецслужб БССР і СССР.

У верасні 1924 г. першым сакратаром ЦК Кампартыі Беларусі становіцца Аляксандр Іванавіч Крыніцкі. Перад намі сакрэтная запіска намесніка паўнамоцнага прадстаўніка АДПУ па Заходнім краі І. К. Апанскага ад 28 снежня 1924 г. першаму сакратару ЦК КП(б)Б А. І. Крыніцкаму аб тых негатыўных працэсах, якія адбываюцца ў беларускім нацыянальным руху, у асяроддзі рэштак непралетарскіх партый і асабліва сярод літаратараў і творчай інтэлігенцыі. Значная частка гэтага паведамлення прысвечана Я. Купалу, Я. Коласу, З. Жылуновічу, З. Бядулю. Найбольш буйнымі дзеячамі беларускай культуры, якія вызначаюць яе накірунак, у запісцы названы Я. Купала, Я. Колас, Я. Лесік, З. Бядуля, Ц. Гартны,



М. Чарот. «Калі Ц. Гартны і М. Чарот узначальваюць сабой рэвалюцыйную плынь, адлюстроўваючы ў сваіх творах настроі сучаснай рэвалюцыйнай эпохі, то першыя чатыры ўяўляюць сабой папутнікаў, інтэлігентаў-шавіністаў, якія ўносяць у літаратуру настроі, чуждыя рэвалюцыі, а часам і контррэвалюцыйныя тэндэнцыі», – піша І. К. Апанскі [1].

Нягледзячы на гэта, Аляксандр Іванавіч вырашыў у адносінах да Я. Купалы прымяніць метад «перніка». У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захоўваецца пастанова Бюро ЦК КП(б)Б «Аб прысваенні Янку Купалу звання народнага паэта БССР»: «Згадзіцца з прысваеннем Янку Купалу звання народнага паэта [БССР]. Сакратар ЦК КП(б)Б А. Крыніцкі» [2].

У сакавіку 1926 г. ЦК КП(б)Б прыняў пастанову «Аб рабоце сярод інтэлігенцыі», у адпаведнасці з якой уся інтэлігенцыя рэспублікі па сваіх палітычных поглядах была падзелена на групы. На гэтай падставе спецыяльная камісія па інтэлігенцыі пачала праверку і ачышчэнне ўстаноў навукі, адукацыі і культуры ад класава чужых элементаў. Прапановы камісіі і спісы з характарыстыкамі работнікаў, складзеных на падставе звестак ДПУ, прадстаўляліся ў Бюро ЦК. У адным такім спісе, які разглядаўся на Бюро ў снежні 1926 г. толькі па Інстытуту беларускай культуры налічвалася 14 прозвішчаў з «кампраметуючымі дадзенымі». Адносна Я. Купалы запісана: «Луцкевич Иван (Я. Купала) –левонароднический уклон, член Инстнтута Белорусской культуры, член Правописно-терминологической комнссии» [3].

На закрытым пасяджэнні бюро ЦК Кампартыі Беларусі 26 лістапада 1926 г. абмеркаванне «праколаў» у рабоце Акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі набыло настолькі востры характар, што старшыня Інбелкульта і партыйнай пяцёркі па арганізацыі канферэнцыі У. М. Ігнатоўскі вымушаны быў адмовіцца ад далейшай работы па матэрыялах канферэнцыі і толькі пад націскам членаў бюро згадзіўся працягваць яе.

У такіх абставінах і ўзнікла пытанне аб п'есе Я. Купалы «Тутэйшыя», у якой былі ўбачаны «мастацка афармленыя элементы нацыянал-дэмакратызму». Тыя самыя «элементы», аб небяспецы якіх першы сакратар ЦК А. І. Крыніцкі гаварыў яшчэ ў верасні 1925 г. на сходзе членаў бюро ячэек

нал-дэмакратызму і падрыхтоўкай палітычных працэсаў 1930-х гг., у якіх Я. Купале адводзілася роля «ідэолага» нацыяналістаў, пра п'есу ўспомнілі зноў. Так у дакладзе Галоўліта (А. Якшэвіча) на пасяджэнні бюро ЦК Кампартыі Беларусі 30 сакавіка 1928 г. яна вылучана ў асобны раздзел «Тутэйшыя», у якім адзначалася: «Тутэйшыя – сатырычныя сцэнкі з менскага жыцця ў перыяд 1918–1920 гг. На фоне цэлага шэрагу адмоўных тыпаў (быўшы паліцэйскі, быўшы чыноўнік, поп, дама і г. д.) адзіны станоўчы тып, рэзанер Янка Здольнік, беларускі народны настаўнік. Гэты герой з моцна выражанай народніцкай афарбоўкай не пазбаўлены моцнага нацыяналістычнага духу. Палітычныя перакананні яго крайне падазроныя. З аднолькавай абывацельскай пасіўнасцю, з падкрэсленым раўнадушшам сустракае ён палітычныя змены, змены ўладаў. Немцы, палякі, бальшэвікі – для яго аднолькавыя. Для яго «гэта ўсё роўна».

Далёкі ад палітычнай барацьбы, грамадскага жыцця, ён шукае свае ідэалы ў мінулым.

Ва ўмовах Савецкае ўлады ён усё яшчэ не ведае, з кім ісці:

«Мы яшчэ хістаемся то ўправа, то ўлева. Яшчэ ясна азначанай мэты не можам сабе ўявіць» (стар. 5). Ён чакае таго моманту, калі ен і яму падобныя стануць «самі сабе гаспадарамі, таму што іначай (пры Савецкай уладзе) ніякага складу ні ладу ў нас не будзе»...

Уся п'еса перапоўнена як замаскіраванымі, так і яўнымі выпадамі супроць Савецкае ўлады» [7].

У 1930 г. пытанне аб сацыяльнай накіраванасці п'есы ўзняў у дакладзе ў Камуністычнай акадэміі ў Маскве загадчык культпропа ЦК КП(б)Б А. А. Сянькевіч. Адказваючы крытыку У. В. Чаржынскаму, які назваў літаратурныя выступленні Я. Купалы «гармануючымі з эпохай», а «Тутэйшыя» – па драматычнай пабудове «веяннем мальераўскага генія на глебе беларускай літаратуры», А. А. Сянькевіч сцвярджаў: «Паглядзім, якую сучаснасць бічуе сваім смехам Я. Купала ў «Тутэйшых». «Тутэйшыя даюць малюнак акупацыі Беларусі, прычым Купала падводзіць час побыту бальшавікоў на Беларусі пад паняцце акупацыі. Значыць, у драме «Тутэйшыя» ён бічуе нашу савецкую рэчаіснасць, ён паднімае на шчыт свайго смеху бальшавікоў, якіх ён у гэтым творы ставіць на адну дошку з польскімі акупантамі» [8, с. 30].

У пачатку студзеня 1930 г. першым сакратаром ЦК КП(б)Б цэнтр адправіць непрыметнага раней функцыянера ЦК ВКП(б) К. В. Гея. Незадоўга да гэтага ў снежні 1929 г. у Беларусь прыбудзе і новы шэф ДПУ рэспублікі Р. Я. Рапапорт. Шэрыя і да прымітыўнасці абмежаваныя асобы, яны ў адведзеных рамках аказаліся надзвычай стараннымі і ініцыятыўнымі выканаўцамі чужой волі, паслядоўнымі праваднікамі «новага курсу». Адной з сваіх галоўных задач яны лічылі разгром «антысавецкай, контррэвалюцыйнай арганізацыі» пад кодавай назвай «Саюз вызвалення Беларусі» (СВБ). Гэта сфабрыкаваная «справа» павінна была стаць апагеем кампаніі па расправе з нацыянал-дэмакратызмам. Па «раскрытай» справе СВБ летам і восенню 1930 г. было арыштавана 108 чалавек, у тым ліку 25 былых членаў партыі беларускіх сацыялістаў-рэвалюцыянераў.

Знаёмства з матэрыяламі следства (а гэта 29 аб'ёмістых тамоў), асабліва з заключным абвінавачваннем, дазваляе зрабіць выснову: бадай што галоўным крытэрыем для залічэння ў СВБ была нацыянальная прыналежнасць, нягледзячы на тое, што на самой справе былі арыштаваны і беларусы, і рускія, і палякі, і яўрэі, і ўкраінцы. Але сярод асуджаных судовай калегіяй ДПУ аказаліся 89 беларусаў і адзін рускі – мастацтвазнаўца М. М. Шчакаціхін.

Вядомы таксама паказанні пры выкліках на допыты ў ДПУ і самаго Я. Купалы. Органы ДПУ не выпадкова праяўлялі да Я. Купалы асаблівую цікавасць: для паспяховага завяршэння пачатай справы ім не хапала галоўнага ідэолага і духоўнага натхняльніка падполля, таму імкнуліся атрымаць як мага больш сведчанняў аб «кіруючым становішчы» Я. Купалы ў СВБ. Нашаму сённяшняму розуму недаступна, але гэта застаецца фактам: частка арыштаваных і тут падыгрывала следчым. Па іх паказаннях, вечары на кватэры ў Я. Купалы, дзе ў гутарках і спрэчках абмяркоўваліся бягучыя пытанні і праблемы беларускай культуры, пераўтвараліся ў зборышчы контррэвалюцыянераў і па-антысавецку настроеных асоб, а гаспадар вечароў маляваўся ў ролі ідэолага нацыянал-дэмакратызму.

Прынамсі, у следчых матэрыялах цяжка знайсці хоць адно якое-небудзь прамое сведчанне ці выказванне, якія можна было б кваліфікаваць як нацыянал-шавіністычныя. Напрык-

... арыштаваны 14 ліпеня 1930 г. А. Цвікевіч пасля чатырох дзён знаходжання ў камеры і «задушэўных» гутарак са следчымі ўласнаручна паказваў: «Я прызнаю сябе вінаватым у тым, што да апошняга лета быў нацыянал-дэмакратам, уваходзіў у арганізацыю беларускай інтэлігенцыі пад назвай «Суполка вызвалення Беларусі». Маё нацыяналістычнае «нутро», менавіта мае нацыянальны настрой і імкненні, штурхалі мяне ў нацыянальны лагер. У гэтым і выявілася мая контррэвалюцыйная сутнасць, я не ў стане быў адмовіцца ад салідарнасці з тымі, хто духоўна быў блізкі да мяне, хто з'явіўся прызнаным лідэрам нацыянальна-культурнага руху, як напрыклад Я. Купала і Я. Колас, ...Ігнатоўскі, Жылуновіч і інш. Ці ў стане я быў у той час назваць гэтую групу контррэвалюцыйнай?

Прызнаюся, што такія меркаванні ніяк не маглі прыйсці ў маю галаву. Як я мог называць контррэвалюцыянерамі Я. Купалу, Ігнатоўскага – камуніста, наркама асветы, Я. Коласа, Прышчэпава – наркома земляробства, М. Чарота, З. Жылуновіча, прызнанных пралетарскіх пісьменнікаў і інш.» [9, с. 92–94].

Між іншым, па першапачатковаму сцэнарыю, колькасць членаў СВБ вызначалі ў некалькі соцень чалавек. Галоўную ролю ў гэтай «справе» ДПУ меркавала адвесці У. Ігнатоўскаму. У спіс членаў кіруючага цэнтру СВБ былі таксама ўнесены Я. Купала і Я. Колас. Але ў творцаў «справы» адбылася асечка: адсутнасць колькі-небудзь абгрунтаваных доказаў у многіх выклікала сумненні ў прыналежнасці У. Ігнатоўскага, Я. Купалы і Я. Коласа да СВБ, што вымушан быў прызнаць на кастрычніцкім 1930 г. пленуме ЦК Кампартыі Беларусі сам кіраўнік ДПУ Р. Рапапорт [10].

Шчырыя прыхільнікі нацыянальнай ідэі, яны тым не менш рашуча і цвёрда адхілілі ўсе абвінавачванні ў свой бок. Больш таго, Я. Купала, як аб гэтым паведамляў К. Гей у пісьме сакратару ЦК ВКП(б) П. Постышаву, наадрэз адмовіўся «пайсці насустрач нам у сэнсе хаця б асуджэння контррэвалюцыйнай дзейнасці сваіх сяброў – удзельнікаў і кіраўнікоў «Саюзу». Дарэчы ў гэтым жа пісьме Гей сцвярджаў: «Янка Купала ўваходзіў у кіруючы цэнтр «Саюза вызвалення Беларусі», з'яўляўся ідэйным цэнтрам нацдэмаўскай контррэвалюцыі, што знайшлі адлюстраванне ў яго

творчасці. Побач з творамі цалкам па зместу савецкімі ў яго маюцца вершы і кулацкага, і непасрэдна контррэвалюцыйнага зместу. Запрошаны для перагавораў у ДПУ, Я. Купала настойліва адмаўляў сваю прыналежнасць да якой бы там ні было контррэвалюцыйнай арганізацыі і не выказаў ніякага жадання пайсці насустрач нам у мэтах хоць бы асуджэння контррэвалюцыйнай дзейнасці сваіх сяброў – удзельнікаў і кіраўнікоў СВБ. Мы вырашылі не дамагацца ад Я. Купалы прызнання аб удзеле ў «Саюзе вызвалення Беларусі» і сканцэнтравалі свае сілы на патрабаванні выступіць з адкрытым асуджэннем контррэвалюцыйнай дзейнасці групы беларускіх інтэлігентаў, арыштаваных па справе СВБ» [11, с. 7].

Не вытрымаўшы той ганьбы і маральнага ціску (нахабства следчых у час выклікаў і допытаў у ДПУ), а таксама той тайнай гульні, якая вялася вакол паэта, Я. Купала на зыходзе лістапада 1930 г. зрабіў спробу самагубства [9, с. 115–116]. Толькі дзякуючы намаганням урачоў Я. Купала застаўся ў жывых.

Захаваўся дакумент ад 22 лістапада 1930 г., прычым купалаўскае аўтарства якога не аспрэчваецца: «Старшыні ЦВК СССР і БССР т. Чарвякову.

Таварыш старшыня!

Яшчэ раз, перад смерцю, заяўляю, што я ні ў якой контррэвалюцыйнай арганізацыі не быў і не збіраўся быць.

Ніколі не быў контррэвалюцыянерам і да контррэвалюцыі не імкнуўся. Быў толькі паэтам, які думаў аб шчасці Беларусі... Няхай жа жыве гэта новае творчае жыццё для шчасця ўсяго чалавецтва.

Янка Купала» [12].

Першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі К. В. Гей вызначыў гэты ўчынак песняра «як пратэст супраць нашай палітыкі барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам». Вось што пісаў ён на наступны дзень пасля спробы самагубства Я. Купалы сакратару ЦК ВКП(б) П. Постышаву: «Лічу неабходным паведаміць, што ўчора раніцай зрабіў пакушэнне на самазабойства Янка Купала – народны паэт Беларусі. Замах на жыццё быў не сур'ёзным. Я. Купала нанёс сабе ўдар перачынным нажом у правы бок. Жыццё яго па-за небяспекай, і калі не будзе ўскладненняў, то дзён праз пяць ён будзе здаровы».

Звяртае на сябе ўвагу характарыстыка ролі Я. Купалы ў сувязі са справай «Саюза вызвалення Беларусі». У пісьме

адзначаецца, што Я. Купала ўваходзіў у кіруючы цэнтр арганізацыі. Аб гэтым сведчаць паказанні некаторых абвінавачаных. Ён з'яўляўся «ідэйным цэнтрам нацдэмаўскай контррэвалюцыі», што знайшло адлюстраванне ў яго творчасці. Разам з творамі яўна савецкімі ў яго маюцца вершы і кулацкага, і контррэвалюцыйнага зместу. Далей у пісьме канстатуецца, што ў ДПУ. БССР Я. Купала настойліва адмаўляў сваю прыналежнасць да якой бы то ні было контррэвалюцыйнай арганізацыі і не выказаў ніякага жадання пайсці насустрач нам у сэнсе хаця б асуджэння контррэвалюцыйнай дзейнасці сваіх сяброў – удзельнікаў і кіраўнікоў СВБ.

Незадоўга да 20 лістапада Я. Купала пачаў падаваць прыкметы некаторых хістанняў. Аднак гэта не знайшло адлюстравання ў яго «перадсмяротным» пісьме. Яно адрасаваиа Чарвякову і ўтрымлівае сцвярджэнне, што ён не быў у контррэвалюцыйнай арганізацыі. Затым Я. Купала спрабуе апраўдаць свой верш, у якім ухваляецца Пілсудскі, а таксама просіць паклапаціцца аб яго сям'і.

У пачатку снежня 1930 г. СНК БССР спецыяльнай пастановай пазбавіў звання акадэміка БАН групу вядомых вучоных (В. Ю. Ластоўскага, У. І. Пічэту, Я. Ю. Лесіка, С. М. Некрашэвіча, Г. І. Гарэцкага і А. Д. Дубаха), якіх абвінавачвалі ў прыналежнасці да контррэвалюцыйнай арганізацыі «Саюз вызвалення Беларусі» (акрамя У. І. Пічэты, які праходзіў у Ленінградзе па «справе акадэміка Платонава»). Напярэдадні прыняцця СНК рашэння аб пазбаўленні акадэмічных званняў некаторых вучоных «як ворагаў пралетарскай дыктатуры» ў бюро ЦК КП(б)Б пад грыфам «Сов. секретно» паступіў дакумент пад назвай «Спнсок академиков БАН с указанием имеющихся на них компрометирующих материалов». Сярод 22 прозвішчаў знаходзім імёны Я. Коласа і Я. Купалы: «...Луцевич Иван Доминикович (Янка Купала).

Член ЦИКа по показаниям арестованных по делу «СВБ», состоял в организации и входил в руководящий центр. Неоднократно по этому поводу допрашивался, но по существу никаких показаний не дал. Накануне представления показаний, которые он написал дома, пытался покончить жизнь самоубийством, но остался жив. До сего времени от осуждения в печати воздерживается» [13].

Непакоячыся аб гонары мундзіра свайго ведамства, кіраўніцтва ДПУ прымусіла параненага Я. Купалу падпісаць падрыхтаваны чэкістамі «пакаянны» ліст, які 14 снежня 1930 г. быў надрукаваны ў рэспубліканскай газеце «Звязда». З'яўляючыся натурай спакойнай, роўнай, сціплай, паэт у той жа час, як успамінаў акадэмік Г. І. Гарэцкі, быў глыбока ранімы, надзвычай чуллівы, сарамлівы і кволы. У тыя нялёгкія для яго дні ён павёў размову пра мудрага гісторыка, які прыйдзе і разбярэцца ва ўсім па-сапраўднаму, раскажа праўду пра час, людзей і падзеі.

Прыдзе новы мудры гісторык,
А ён прыдзе – ужо ён ідзе –
І сказ дзіўны, праўдзівы ад зорак,
І да зорак аб нашых прасторах,
Аб падзеях, людзях павядзе...

Напалоханыя замахам на свае жыццё Я. Купалы і самагубствам У. Ігнатоўскага 4 лютага 1931 г., ДПУ БССР на некаторы час некалькі сцішылі кампанію выкрыцця нацдэмаў, часткова знялі і часткова змянілі абвінавачванні ў адрас У. Ігнатоўскага. 25 кастрычніка 1932 г. у ЦК КП(б)Б адбылася літаратурная нарада, старшынёй якой быў сакратар ЦК В. Ю. Жаброўскі.

Значнае месца ў яго прамове заняло вызначэнне палітычнай лініі, якую літаратары-камуністы павінны праводзіць у адносінах да пісьменнікаў старэйшага пакалення Я. Купалы, Я. Коласа, З. Бядулі, З. Жылуновіча «ў мэтах іх перавыхавання і поўнага перавода на савецкую платформу». Сутнасць гэтага «перавыхавання» вызначала апошняя фраза ў прамове В. Ю. Жаброўскага:

«Калі яны будуць ісці з намі, дапамагаць нам будаваць бяскласавае сацыялістычнае грамадства – калі ласка, запрашаем, даём шырокую дарогу. Калі не, то той, хто не з намі, той супраць нас» [14].

На згаданай вышэй літаратурнай нарадзе ў ЦК КП(б)Б сакратаром ЦК КП(б)Б афіцыйна было заяўлена, што ніякага «новага нэпа» ў літаратуры ў рэспубліцы не будзе, а ад пісьменнікаў патрабуецца адно – трывала стаць на шлях сацыялістычнага будаўніцтва. 25 студзеня 1933 г. бюро ЦК Кампартыі Беларусі прымае разгорнутую пастанову «Аб фактах прасочвання класава варожых, нацыянал-дэмакра-

тычных уплываў у мастацкай літаратуры БССР». Пастанова як афіцыйная рэакцыя вышэйшага партыйнага органа на становішча ў мастацкай літаратуры ў час яе перабудовы вызначала накірункі палітыкі ў адносінах да пісьменнікаў і пісьменніцкай арганізацыі, якая стваралася. З'яўленне ў газеце «Літаратура і мастацтва», часопісе «Беларусь калгасная» і іншых выданнях твора С. Я. Баранавых «Матчын сын», артыкулаў Сідарэнкі, прысвечаных юбілею Я. Купалы паэмы М. У. Нікановіча «Журавіны» і іншых кваліфікавалася як «класава варожая вылазка рэваншысцкіх, нацыянал-дэмакратычных элементаў».

За допушчаную палітычную блізарукасць адказныя кіраўнікі Наркамасветы БССР, Галоўліта, Дзяржаўнага выдавецтва рэспублікі атрымалі вымовы, а некаторых з іх, у тым ліку загадчыка Галоўліта БССР, знялі з займаемых пасад. Пісьменніку Платону Галавачу за тое, што ўключыў у зборнік вершаў Я. Купалы, які рэдагаваў, шэраг, як адзначалася ў пастанове, «адкрыта нацыяналістычных, класава варожых твораў» без «рэдакцыйных заўваг і палітычнай іх ацэнкі», абвяшчалася строгая вымова з папярэджаннем.

У той жа час органы бяспекі не забыліся пра Я. Купалу і Я. Коласа, і з сярэдзіны 1930-х гг. на іх зноў пасыпаліся абвінавачванні.

На першы погляд, першы сакратар ЦК КП(б)Б М. Ф. Гікала быццам бы вельмі паважаў Я. Купалу. У той жа час ЦК пад яго кіраўніцтвам фактычна праігнараваў 50-гадовы юбілей народнага песняра.

Таталітарная сістэма ў асобе М. Ф. Гікалы аказалася несумяшчальнай з творчай асобай, спрабавала ўсяляк уздзейнічаць на творчасць Я. Купалы ў патрэбным напрамку. Гэта праявілася ў выступленні кіраўніка Кампартыі Беларусі ў верасні 1934 г. на сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі – удзельнікамі I Усесаюзнага з'езда савецкіх пісьменнікаў: «Вы думаете, я забываю полнтически неверные вещи, вещн контрреволюционного порядка. Вы помните «Журавіны», «Матчын сын» и т. д. (гаворка ідзе аб вершах Я. Купалы. – *Э. І.*). С нашей стороны было всего маленькое воздействие, помощь вам, вы это дело выправили, а сегодня попробуйте-ка выпустить такие «Журавіны», разве вы их

пропустите, да тот же Я. Купала скажет: «Это дело политическое», такое давайте не печатать».

У маі 1938 г. наркомам унутраных спраў БССР прызначаецца А. А. Наседкін. Калі ў сиежні 1938 г. крэсла пад ім захісталася, следчыя НКУС, сталі засыпаць першага сакратара ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнку заявамі, у якіх абвінавачвалі свайго А. А. Наседкіиа ў розных парушэннях законнасці. У гэтых лістах, якіх у архіве нямала, пастаяииа ўпамінаюцца імены Я. Купалы і Я. Коласа. Так, намеснік иачальніка 4-га аддзела УДБ НКУС БССР І. Кунцэвіч у сваёй заяве ад 11 снежня 1938 г. пісаў: «В настоящем протоколе (пратакол допыта паэта А. І. Александровіча. – *Э. І.*) я обнаружил виесениые собственноручно наркомом т. Наседкиным целые новые вопросы и ответы, а на страиице 45 протокола допроса обиаружил приписанный Наседкиным такой вопрос: «Кто же вам известен как руководитель организации?» И иа этот вопрос, написанный собственноручио Наседкиным, ответ следующего содержания: «Из руководства организацни мне известны только Левицкий (другі сакратар ЦК КП(б)Б (1937–1938). – *Э. І.*), Потапейко (сакратар ЦК КП(б)Б (1937). – *Э. І.*) и Стакун (старшыня ЦВК БССР (1937) – *Э. І.*), кроме того, и к руководству стояли Пивоваров (наркам асветы БССР (1937–1938) – *Э. І.*), Я. Купала, Я. Колас, Дорожкин (дырэктар Інстытута біялогіі АН БССР (1938). – *Э. І.*), других лиц не знаю»...» [15].

Між іншым, следчыя НКУС БССР ніколі не ставілі пад сумленне «варожую дзейнасць» Я. Купалы, Я. Коласа і іншых пісьменнікаў, былі ўпэўнены, што іх патрэбна «ізаляваць ад грамадства». Аб гэтым сведчыць, иапрыклад, заява аператыўнага ўпаўнаважанага 4-га аддзела УДБ НКУС БССР М. Вольфтруба першаму сакратару ЦК Кампартыі Беларусі П. К. Панамарэнку ад 11 снежня 1938 г.: «В июне–июле месяце 1938 г. 4-м отделом УГБ НКВД БССР была ликвидирована частично национал-фашистская оргаиизация в Академии наук БССР и Наркомпросе. Ликвидация этой контрреволюционной организации прошла без всякой проверки через агентуру, в результате ряд (нх) были арестоваиы иеобоснованно по 1-му только показанию арестованных, и принадлежность их к нацфашистской организацни вызывает сомиение... В то же время руководители этой иацдемократической организации по сей день находятся на свободе (Ку-

пала, Колас, Вольфсон, Дудков и ряд других). Для меня это совершенно непонятно» [16].

Паўстае пытанне, як жа на самой справе ставіўся П. К. Панамарэнка да Я. Купалы, Я. Коласа і наогул да пісьменніцкай арганізацыі рэспублікі.

У канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. XX ст. склалася легенда, што Я. Купалу і Я. Коласа выратаваў ад рэпрэсій П. К. Панамарэнка. Гэта пытанне разглядае беларускі даследчык Р. Платонаў у артыкуле «АДПУ-НКУС супраць беларускіх пісьменнікаў» [17, с. 61–68]. Ён адзначае: «Хто ж выратаваў пісьменнікаў: Панамарэнка ці Сталін?»

Сёння (артыкул напісан у 1994 г. – *Э. І.*), калі даследчыкі атрымалі больш свабодны доступ да архіўных крыніц і магчымасць іх друкаваць, шмат якія легенды, міфы губляюць арэол загадкавасці, і падзеі паўстаюць, мякка кажучы, некалькі ў іншым выглядзе. У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захоўваецца ўнікальны дакумент, які пралівае святло і на легенду аб замене «ордэраў на ордэны». Дакумент гэты –11 старонак – другі экземпляр запіскі на імя І. В. Сталіна «О белорусском языке, литературе и писателях», падпісанай П. К. Панамарэнкам 21 лістапада 1938 г. (першы экземпляр пасланы ў Маскву) [17, с. 65]. І вось што ў ёй можна прачытаць: «В результате разгрома покровительствовавших писателям националистов врагов, в результате того, что народ их «не оценил» и произведения их лежат на полках и до читателя доходят только обязательные в белорусских школах хрестоматии, заполненные их творчеством, в результате образовавшейся вокруг них пустоты, среди них царят растерянность и озлобление. Начали дико пить – заливать вином тоску о «свободной Белоруссии».

Я. Купала недавно сказал: «Все наши карты биты, лучшие люди истреблены, надо самому делать харакири (он уже пытался один раз покончить с собой) ...Наиболее крупную контрреволюционную националистическую работу провел союз «советских писателей Белоруссии, идейно возглавляемый всегда десятком профашистских писателей (в том числе и известные Янка Купала и Якуб Колас) и всегда для прикрытия (в том числе и сейчас) имевший у руководства коммунистов.

...В отношении Янки Купалы, Якуба Коласа, Бровко, Глебко, Крапивы, Бядули, Вольского, Аксельрода и др. членов этой «могучей кучки», узурпировавшей представительство от белорусской интеллигенции всюду, в том чнсле и за рубежом, творческая авторитетность которых непомерно раздута, проводивших лично всю описаиную вражескую работу, имеются многие показания разоблаченных и арестованных врагов, нзобличаюшие их вплоть до связей с польской дефензивой.

В отношеиии Я. Купалы имеется 41 – показание, в большиистве прямые; Я. Коласа – 31 показание, Крапивы – 12 показаний и т. д.

По количеству и качеству изобличающего материала, а также по известным иам фактам их работы, они, безусловно, подлежат аресту и суду, как враги народа. В частности, Наркомвнудел Белоруссии запросил из центра саикцию на арест Купалы и Коласа уже давно, но саикция пока ие дана. Положение в отношении к ним сложное. Оии, главным образом Янка Купала и Якуб Колас, пользуются нзвестностью. Прославили нх достаточио сильно, их включают во всякие комиссии по учебиикам, словарям, переводам, литературным юбилеям. Не допустить этого, значит, сразу определить свое отношеиие к иим, а его, по моему миеиию, определить иужно не так. Их нужио или арестовать или, учитывая обстановку, принять, поговорить открыто, показать, что нам известны все их «ошибки», если это допустимо так иазвать, сказать, что они могут искупить свою вину перед Советской властью, призвать их к честной работе, посмотреть, как оии будут реагировать, и если в какой-либо мере пойдут на это, то использовать это в целях разложения группы, отрыва наиболее честного (из них) и ликвидацию остатков нацдемовщиины. При разговоре, конечно, не смягчать действительной оцеики их роли, но делать это с сответствуюшнм такому щепетильному разговору тактом».

Запіска заканчвалася такою просьбаю: «По двум вопросам: а) о предлагаемых мероприятиях в отношении белорусского языка – грамматики и литературы (гэтаму прызначана зиачная частка запіскі. – *Э. І.*); б) об отношении к писателям Я. Купале и Я. Коласу – я прошу Вас дать мне совет».

Такім чынам, у канцы лістапада 1938 г. П. Панамарэнка лічыў, што Я. Купала і Я. Колас падлягалі альбо арышту (санкцыя з Цэнтра запрошана даўно, але «пакуль што не дадзена»), альбо запрашэнню дзеля «адкрытай» размовы, у часе якой павінны былі прызнацца ў варожай дзейнасці і пачуць пра ўмовы «загладжвання сваёй віны перад Савецкай уладай». Парады, як паступіць, ён чакаў ад Сталіна» [20].

Праз месяц пасля першай запіскі – 26 снежня 1938 г. П. Панамарэнка раптам піша Сталіну другую, якая ўжо канчаецца словамі: «В связи с двадцатилетием БССР представляю для награждения работников промышленности, сельского хозяйства, науки и искусства Белоруссии, имеющих заслуги перед Родиной». Да яе прыкладзены спіс на 40 чалавек і іх кароткія характарыстыкі. Першыя ў спісе – Янка Купала, Якуб Колас і Міхась Лынькоў. У характарыстыках гаворыцца: «...Янка Купала (Купала Иван Доминикович). Известный белорусский поэт, 1882 г. рождения, белорус, беспартийный. За годы Советской власти создал ряд замечательных советских произведений. Классик белорусской литературы. Член Белорусской и Украинской Академии наук» [21].

У падобным духу былі напісаны характарыстыкі на Якуба Коласа і Міхася Лынькова.

Дык што ж адбылося на працягу гэтага месяца? Адкуль такая рэзкая перамена ў пазіцыі першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі? Аўтарытэтны вучоны-гісторык Расціслаў Платонаў выказвае наступную версію або пункт погляду:

«Хутчэй за ўсе дзесьці ў гэты час і адбылася яго сустрэча са Сталіным. І няцяжка ўявіць, якая парада была дадзена: «Навошта арыштоўваць? Навошта пагражаць? Патрэбна ўзнагародзіць» – і «ціхаю кацінаю паходкаю» падвеў аўтара запіскі да селектара. Так што заслуга «замены ордэраў на ордэны» належыць ніяк не П. Паиамарэнку. Сталін умеў мяняць бізун на пернік» [17, с. 66–67].

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР быў апублікаваны ў газетах Беларусі 2 лютага 1939 г. пад назвай «Аб узнагароджанні савецкіх пісьменнікаў» і з прэамбулаю – «за выдатныя поспехі і дасягненні ў развіцці савецкай мастацкай літаратуры». У ліку 21 пісьменніка, удастоеных ордэна Леніна, знаходзім імёны Коласа Якуба і Купало Янко (так ва ўказе. – *Э. І.*); сярод 49 чалавек, узнагароджаных ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга – С. Я. Бядуля, М. Ц. Лынькоў, Э. Л. Самуйлёнак. З 132 узнагароджаных – 7 беларускіх пісьменнікаў. Значыць, узнагароджваліся не пісьменнікі Беларусі асобна, а вялікая група пісьменнікаў усяго Савецкага Саюза, і для беларусаў гэта толькі супала са святкаваннем 20-годдзя БССР і Вечарамі беларускай культуры ў Маскве. На вялікі жаль, аўтару гэтых радкоў у архівах Беларусі і Расіі пакуль што не ўдалося знайсці якіх-небудзь рэзалюцый першых сакратароў Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі, якім адрасаваліся інфармацыі, паведамленні, рапарты з АДПУ-ДПУ-НКУС БССР, наконт Я. Купалы і Я. Коласа. Хутчэй за ўсё іх «прымалі да ведама», захоўвалі «на ўсялякі выпадак», а распараджэнні аб адносінах да народных песняроў давалі вусна, па тэлефону і пры асабістых сустрэчах.

Аб тым, што ЦК Кампартыі Беларусі і органы бяспекі БССР адчувалі хваравітую падазронасць да народнага паэта рэспублікі Янкі Купалы і на працягу ўсяго жыцця паэта вялі супраць яго патаемную вайну, цяпер добра вядома. Выпадак са спробай самагубства народнага песняра ў лістападзе 1930 г. – толькo адно з трагічных сведчанняў таго, да якіх крайнасцей даходзіла гэтая непрыязнасць.

З аднаго боку, знешне выглядала ўсё добрапрыстойна. Супраць Я. Купалы і Я. Коласа не праводзілася адкрытых дзеянняў рэпрэсіўнага характару. Абодва пісьменнікі займаліся літаратурнай творчасцю, друкаваліся ў газетах і часопісах, выдавалі кнігі, вялі вялікую навуковую і грамадскую працу. Яны атрымалі званне народных паэтаў, сталі акадэмікамі АН Беларусі. Урад Рэспублікі ў знак прызнання заслуг Я. Купалы і Я. Коласа перад беларускай літаратурай пабудаваў ім за дзяржаўны кошт дачы, выдзеліў кожнаму з іх для асабістага карыстання легкавую машыну. У гэтым, безумоўна, была заслуга першых сакратароў ЦК КП(б)Б А. І. Крыніцкага, В. Г. Кнорына, М. Ф. Гікалы і асабліва старшыні СНК БССР М. М. Галадзеда і старшыні ЦВК Беларусі А. Р. Чарвякова, у якога былі даволі сяброўскія адносіны з Я. Купалам.

З другога боку, ужо з 1920-х гг. і да самой смерці Я. Купалы з боку таталітарнай, камандна-адміністратыўнай сістэмы,

прадстаўнікамі якіх былі ЦК Кампартыі Беларусі і органы бяспекі, супраць асобы і творчасці народнага песняра вяліся пастаянны ціск і барацьба, мэтай якіх было падпарадкаванне яго «пяра» сацыялістычнаму будаўніцтву, псіхалагічнае ўздзеянне на Я. Купалу, імкненне не толькі зламаць яго ідэйную пазіцыю, прымусіць яго стаць праваднікам ідэй Камуністычнай партыі Беларусі і яе ЦК, а потым, карыстаючыся яго аўтарытэтам, уздзейнічаць на іншых дзеячоў беларускай навукі і культуры. Безумоўна, самымі актыўнымі «антыкупалаўцамі» былі першы сакратар ЦК КП(б)Б у 1930–1932 гг. К. В. Гей, старшыня ДПУ БССР Р. Я. Рапапорт (1929–1931) і нарком унутраных спраў БССР А. А. Наседкін (1938). Усе гэта трэба ўлічваць пры разгадцы тайны смерці Я. Купалы 28 чэрвеня 1942 г.

**Спіс літаратуры**


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 4. – Воп. 21. – Адз. зах. 1394. –Л. 117–118.
2. НАРБ. – Фонд 4. – Воп. 3. – Адз. зах. 5. – Л. 284.
3. НАРБ. – Фонд 4. – Воп. 21. – Адз. зах. 163. – Л. 74.
4. НАРБ. – Фонд 4. – Воп. 3. – Адз. зах. 219. – Л. 268.
5. НАРБ. – Фоид 4. – Воп. 3. – Адз. зах. 19. – Л. 186.
6. Х съезд Коммунистической партии (большевиков) Белоруссии. – 3 января 1927 г. – Стенографический отчет. – Минск, 1927.
7. НАРБ. – Фонд 4. – Воп. 3. – Адз. зах. 22. – Л. 1033–1034.
8. Бальшавік Беларусі. – № 8–9. – Мінск, 1930.
9. *Ігнаценка, І.* Усевалад Ігнатоўскі і яго час / І. Ігнаценка, А. Кароль. – Мінск, 1991.
10. НАРБ. – Фонд 4. – Воп. 21. – Адз. зах. 1243. – Л. 94.
11. Возврашеиные имена. Сотрудники АН Белоруссии, пострадавшие в период сталинских репрессий. – Минск, 1992.
12. Вечерний Минск, – 14 марта. – 1989.
13. НАРБ. – Фонд 4. – Воп. 3. – Адз. зах. 41. – Ч. 1. – Л. 81.
14. Стэнаграма літаратурнай нарады захоўваецца ў НАРБ: фонд 4-п. – Воп. 1. – Адз. зах. 118. – Л. 1–218.
15. НАРБ. – Фонд 4. – Воп. 21. – Адз. зах. 1398. – Л. 35.
16. НАРБ. – Фонд 4. – Воп. 21. – Адз. зах. 1398. – Л. 56.
17. *Платонаў, Р.* АДПУ – НКУС супраць беларускіх пісьменнікаў / Р. Платонаў // Беларускі гістарычны часопіс. – Минск, 1994. – № 3.
18. НАРБ. – Фонд 4. – Воп. 21. – Адз. зах. 1269. – Л. 18–29.
19. НАРБ. – Фонд 4. – Воп. 21. – Адз. зах. 1269. – Л. 50.